ІНФАРМАЦЫЙНЫ ЛІСТ

# XXIII Міжнародная навуковая канферэнцыя маладых вучоных «МОЛАДЗЬ У НАВУЦЫ – 2026»

13–15 кастрычніка 2026 года,
г. Мінск, НАН Беларусі

Савет маладых вучоных НАН Беларусі праводзіць штогадовую XXIII Міжнародную навуковую канферэнцыю маладых вучоных «МОЛАДЗЬ У НАВУЦЫ – 2026».
Запрашаем студэнтаў, магістрантаў, аспірантаў і маладых вучоных прыняць удзел у працы канферэнцыі.

## Агульныя ўмовы

**Фармат:** Вочны (Мінск, пр. Незалежнасці, 66)
**Рабочыя мовы канферэнцыі:** Беларуская, руская, англійская
**Рэгістрацыйны ўзнос:** Не патрабуецца
**Тэрмін падачы матэрыялаў:** **1 жніўня 2026 года**

## Секцыі

**1** Аграрныя навукі

**2** Біялагічныя навукі

**3** Медыцынскія навукі

**4** Фізіка-тэхнічныя навукі

**5** Фізіка, матэматыка, інфарматыка

**6** Хімія і навукі пра Зямлю

**7** Гуманітарныя навукі і мастацтвы: беларуская мова і літаратура; беларуская культура, мастацтва; гісторыя; сацыялогія; філасофія; эканоміка.

## Формы ўдзелу

- Вусны даклад
- Постарны даклад

## Парадак падачы матэрыялаў

Для ўдзелу неабходна да **01.08.2026** накіраваць ліст на адрас **conf@presidium.bas-net.by** з файламі:

1. **Заяўка** па прапанаванай форме (файл у фармаце .xls або .xlsx, імя файла: N_Ivanou_zayauka.xlsx, дзе N-нумар секцыі згодна нумарацыі, прыведзенай вышэй);
2. **Тэзісы даклада** (файл у фармаце.doc ці .docx, імя: N_Ivanou_tezis.docx);
3. **Экспертнае заключэнне** аб магчымасці публікавання ў адкрытым друку (файл .pdf або .jpg, падпісаны і з пячаткай арганізацыі, імя: N_Ivanou_act.pdf);
4. **Справаздача** з сістэмы «Антиплагиат.ВУЗ» або «Антиплагиат.Эксперт» (выкарыстанне бясплатных версій, а таксама сэрвісаў text.ru, etxt і advego не дапускаецца), які пацвярджае арыгінальнасць тэксту не менш за 70 %. Імя файла: N_Ivanou_antyplagiyat.pdf.

**У тэме ліста пазначце:**
**Нумар секцыі_Прозвішча**

# Патрабаванні да афармлення тэзісаў (вытрымкі з правілаў)

Просім аднесціся да афармлення ўважліва. Матэрыялы, якія не адпавядаюць шаблону, будуць адхілены

| Элемент афармлення | Патрабаванне |
|---|---|
| **Шрыфт і аб'ём:** | 11 кегль, шрыфт Times New Roman. Міжрадковы інтэрвал — адзінарны. Аб'ём тэксту — не больш 2 старонак! |
| **Загаловак** | **ПАЎТЛУСТЫ ВЯЛІКІМІ ЛІТАРАМІ** (не больш за 2 радкі) |
| **Аўтары** | І. І. Іваноў (светлы курсіў, дакладчыка <u>падкрэсліць</u>) |
| **Арганізацыя і e-mail** | Назва арганізацыі, горад, краіна (малымі, курсіў). E-mail дакладчыка |
| **Структура** | Увядзенне. Матэрыялы і метады. Вынікі і іх абмеркаванне. Вывады. Літаратура |
| **Ілюстрацыі** | Не больш за 1 рысунак і 1 табліцу на ўвесь тэзіс |
| **Формулы** | Уводзяцца ў рэдактары MathType (лацінскія зменныя — курсіў, грэчаскія і лічбы — прамы шрыфт) |
| **Спіс літаратуры** | 9 кегль, не больш за 3 крыніцы. Афармленне — паводле СТБ 7.1-2024 (правілы ВАК РБ) |

*Узоры заяўкі, тэзісаў даклада, экспертнага заключэння аб магчымасці публікавання ў адкрытым друку даступны на сайце канферэнцыі.*
*Аргкамітэт пакідае за сабой права адхіляць матэрыялы, якія не адпавядаюць тэматыцы канферэнцыі, правілам афармлення, дасланыя без экспертнага заключэння, праверкі ўнікальнасці тэксту.*

**Падрабязнасці — на сайце канферэнцыі**

https://sites.google.com/view/youthinscience

**Агульныя пытанні и сувязь з Арганізацыйным камітэтам**

conf@presidium.bas-net.by

**Будзем рады бачыць Вас сярод удзельнікаў канферэнцыі!**